# БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯСПАРА ЯК АБ'ЕКТ І ІНСТРУМЕНТ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

***Місуна П. І.,*** *Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь*

Па розных ацэнках, колькасць беларусаў, якія пражываюць за мяжой, складае ад 2,5 да 3,5 млн чалавек, то бок каля 26—37 % насельніцтва самой Беларусі. Беларуская дыяспара прадстаўлена ў больш чым 70 краінах свету. Беларуская дыяспара — у цэлым сфармаваная транснацыянальная грамада, якая характарызуецца дастаткова устойлівымі сувязямі кіравання і міжгрупавых камунікацый, інстытутаў, у пэўнай ступені захоўвае сваю ідэнтычнасць ва ўмовах прымусовай асіміляцыі.

Знаходзячыся ў розных аб'яднаннях, у сваёй актыўнай частцы беларуская дыяспара характарызуюцца дастатковай сталасцю такіх рысаў, як агульнасць этнічнай самасвядомасці, асаблівая сувязь з беларускай дзяржавай, якая разглядаецца ў якасці радзімы. Між тым, у беларускай дыяспары маюцца пэўныя праблемы, уключаючы: нізкую нацыянальную самасвядомасць; асіміляцыю; падзел па палітычных матывах. Яна не з'яўляецца досыць значным суб'ектам палітычных працэсаў не толькі міжнароднага, але і ўнутрыдзяржаўнага ўзроўню ў краінах знаходжання.

Працэсы ўзаемадзеяння Беларусі і яе дыяспары маглі б развівацца больш хуткімі тэмпамі ў плане як часу, так і эфектыўнасці, калі б афіцыйны Мінск і беларусы замежжа мелі агульныя погляды на гістарычнае мінулае краіны і на будучыню яе развіцця.

З 1990 г. ў Беларусі працуе Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», якое актыўна супрацоўнічае з беларускімі дыяспарамі па ўсім свеце, папулярызуе і адстойвае яе правы ў краіне зыходу. З 2005 г. садзейнічанне рэалізацыі нацыянальных, культурных і іншых правоў і законных інтарэсаў беларусаў замежжа з'яўляецца адной з асноўных задач знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. У 2013—2015 гг. у краіне рэалізоўвалася Дзяржаўная праграма супрацоўніцтва з беларусамі замежжа «Беларусы ў свеце».

З моманту прыняцця 16 чэрвеня 2014 г. Закона Рэспублікі Беларусь «Аб беларусах замежжа» статус беларускай дыяспары ў якасці аб'екта і інструмента знешняй палітыкі Беларусі, несумненна, павысіўся, палітыка дзяржавы па выбудоўванні ўзаемаадносін з беларусамі замежжа стала больш сістэмнай.

У мэтах развіцця ўзаемавыгадных адносін афіцыйнай улады Рэспублікі Беларусь з беларускай дыяспарай першай варта прытрымлівацца прынцыпаў адкрытасці для супрацоўніцтва, плюралізма, павагі да рознасці ў поглядах, пазіцыях, меркаваннях і быць гатовай працягнуць працу па трансфармацыі вобраза дзяржавы зыходу ў сяброўскі ў адносінах да беларусаў замежжа.

Але з-за таго, што беларуская дыяспара, па-першае, не валодае той вагой у палітычным жыцці заходняга і ўсходняга свету, які маюць класічныя яўрэйская дыяспара ў ЗША, або армянская ў Францыі, па-другое, не заўсёды салідарызуецца з афіцыйным поглядам Мінска ў дачыненні да беларускай гісторыі і шляхоў далейшага развіцця краіны, заўчасна казаць пра тое, што беларуская дыяспара стала значным інструментам знешняй палітыкі беларускай дзяржавы, які спрыяе прасоўванню інтарэсаў Беларусі за мяжой.

Калі Рэспубліка Беларусь будзе разглядаць беларускую дыяспару ў якасці важнага нацыянальнага, інтэлектуальнага, сацыяльна-культурнага, дэмаграфічнага і эканамічнага рэсурса, апошняя мае здольнасць стаць істотным фактарам рэалізацыі беларускай знешняй палітыкі, прыярытэтам якой з'яўляецца развіццё гандлёва-эканамічных і культурных сувязяў з замежнымі краінамі ў інтарэсах Рэспублікі Беларусь і павышэнне міжнароднага іміджу беларускай дзяржавы. Важкім напрамкам ўзаемаадносін беларускай дзяржавы з беларусамі замежжа, які спрыяе узмацненню стваральнай ролі беларускай дыяспары ў прасоўванні знешнепалітычных інтарэсаў нашай краіны, з'яўляецца працяг супрацоўніцтва бакоў у мэтах запаволення тэмпаў асіміляцыі беларускай дыяспары, захавання яе нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, росту ў свядомасці беларусаў замежжа перакананасці ў тым, што дзяржава зыходу пра іх ведае і бачыць у беларусах замежжа неад'емны складнік палітыкі выказвання і прасоўвання сваіх нацыянальных інтарэсаў за мяжой.

## ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ С ТРАНСНАЦИОНАЛЬНЫМИ КОМПАНИЯМИ В РАМКАХ РЕАЛИЗАЦИИ ВНЕШНЕЙ ПОЛИТИКИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

***Мордосевич Е. Л.,*** *Белорусский государственный экономический университет,*
***Малевич Ю. И.,*** *Белорусский государственный университет*

В Республике Беларусь в документах программного характера отмечается важность налаживания работы с транснациональными компаниями (ТНК) и активизации внешнеэкономической политики и международного сотрудничества. Во исполнение данных документов основная масса мероприятий нацелена на трансфер технологий, получение доступа к товаропроводящей сети, налаживание сотрудничества между белорусскими производителями и ТНК.

Однако следует учитывать, что данные положения носят стратегический характер и опираются на государственные потребности, нежели на спрос или интерес ТНК к сотрудничеству. Как следствие наблюдается низкая инвестиционная и экономическая активность со стороны крупных иностранных компаний выраженная нереализованными планами по приватизации и привлечению прямых иностранных инвестиций.

Для преодоления разрыва между объявленными целями и полученными результатами хотелось бы обратить внимание на такую тактическую составляющую международной политики как развитие партнерских отношений между ТНК и государственными органами Республики Беларусь, а именно: получение международной экспертизы в процессе подготовки нормативных правовых актов, направленных на совершенствование условий ведения бизнеса; налаживание двухсторонней коммуникации.

В процессе подготовки нормативных правовых актов государственные органы используют процедуру общественного обсуждения (редко) и/или институт общественно-консультативных (экспертных) советов (не реже раз в квартал). При помощи данных инструментов, как правило, происходит обсуждение законодательных новаций. Круг участников формируется из представителей бизнес-